# Водзыў

аб аўтарэфераце дысертацыі Панова Сяргея Веніямінавіча «Развіццё школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь», прадстаўленай на атрыманне вучонай ступені доктара педагагічных навук па спецыяльнасці 13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі

Аўтарэферат дысертацыйнага даследавання С.В.Панова «Развіццё школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь», прадстаўленага на атрыманне вучонай ступені доктара педагагічных навук па спецыяльнасці 13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі, сведчыць аб яго адпаведнасці заяўленай спецыяльнасці і галіне навукі. У дадзеным аўтарэфераце асвятляецца, зыходзячы з яго праблематыкі, гісторыя адукацыі, што адпавядае гісторыка-педагагічнаму тыпу даследавання. Спецыфіка такога даследавання, вызначаная яго аўтарам у першым палажэнні, якое выносіцца на абарону, заключаецца ў спалучэнні метадалагічных асаблівасцей гісторыі адукацыі як галіны педагагічнай навукі і метадалагічных прынцыпаў гістарычнага пазнання як галіны гістарычнай навукі. Такі навуковы сінтэз прадвызначыў міждысцыплінарнасць даследавання. Яна праяўляецца ў комплексным пазіцыяніраванні саіскальнікам школьнай гістарычнай адукацыі як інстытуцыянальна-ведамаснай сістэмы і як сацыягуманітарнай з'явы. Пры гэтым вызначальным з'яўляецца тое, што школьная гістарычная адукацыя характарызуецца саіскальнікам як комплексная шматкампанентная і шматфактарная педагагічная сістэма. Саіскальнікам удакладнены канцэптуальна-метадалагічны, інстытуцыянальна-функцыянальны, змястава-дзейнасны, сацыяльна-аксіялагічны кампаненты школьнай гістарычнай адукацыі з адпаведнымі ім фактарамі. Пры гэтым характарыстыка саіскальнікам шэрага фактараў мае нацыянальна-вызначальны характар. Гэта перш за ўсё дзяржаўная гістарычная палітыка, накіраваная на замацаванне беларускай нацыянальнай канцэпцыі гістарычнага мінулага і беларускай мадэлі гістарычнай памяці. У дадзеным кантэксце варта падкрэсліць як актуальнасць гісторыка-педагагічнага даследавання для развіцця менавіта беларускай нацыянальнай педагагічнай думкі і адукацыі, так і ўніверсальнасць даследавання, якая праяўляецца праз сканструяваную саіскальнікам мадэль вывучэння працэсу развіцця школьнай гістарычнай адукацыі. Дадзеная мадэль графічна прадстаўлена на с. 21 аўтарэферата і мае сваё зместавае апісанне ў другой главе дысертацыі.

Сведчаннем выкарыстання міждысцыплінарнага падыходу можна лічыць спасылку саіскальніка на культуралагічную канцэпцыю зместу адукацыі як метадалагічнай асновы даследавання разам з вызначэннем пераемнасці гістарычнай памяці і сістэмы традыцыйных каштоўнасцей сучаснага беларускага грамадства, што з'яўляюцца маркерамі развіцця школьнай гістарычнай адукацыі пры разуменні яе зместу як сацыяльнага вопыту сучаснага беларускага грамадства. Аб міждысцыплінарнасці даследавання таксама сведчыць комплексная характарыстыка саіскальнікам

рэалізацыі ў змесце школьнай гістарычнай адукацыі як агульнапедагагічных падыходаў, у прыватнасці культуралагічнага ў пераемнасці з кампетэнтнасным, так і метадалагічных падыходаў акадэмічнай гістарычнай навукі (фармацыйны, мадэрнізацыйны, цывілізацыйны), якія спалучаюцца, у сваю чаргу, з прадметна-гістарычнымі (гісторыка-крыніцазнаўчы, гісторыка-антрапалагічны, гісторыка-аксіялагічны).

Безумоўнай навуковай навізной даследавання варта лічыць канцэптуалізацыю даследавання працэсу развіцця школьнай гістарычнай адукацыі і яе канцэптуальных асноў як сацыягуманітарнай з'явы праз міждысцыплінарныя канцэпты гістарычнай памяці, нацыі і нацыянальнай ідэі, нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці, беларускай дзяржаўнасці, традыцыйных каштоўнасцей сучаснага беларускага грамадства. Саіскальнікам упершыню прадстаўлены намінатыўныя вызначэнні беларускай нацыянальнай ідэі, тэарэтычна вызначаныя прадстаўнікамі сучаснага беларускага навукова-педагагічнага супольніцтва і рэалізаваныя ў змесце школьнай гістарычнай адукацыі. Варта пры гэтым адзначыць, што думка вядомага расійскага педагога А. В. Хутарскога аб тым, што нацыянальная ідэя з'яўляецца асновай для канструявання педагогікі і дыдактыкі, лагічна развіваецца саіскальнікам адносна светапоглядных асноў развіцця сучаснай школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь з улікам нацыястваральнага патэнцыялу гісторыі Беларусі.

Аўтарам даследавання, як сведчыць аналіз аўтарэферата, распрацавана чатырохэтапная перыядызацыя працэсу развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь з улікам рэалізацыі Канцэпцыі школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь 2022 г., у стварэнні якой прымаў удзел саіскальнік. Дадзеная перыядызацыя грунтуецца на канцэптуальных асновах школьнай гістарычнай адукацыі ў трох пакаленнях канцэпцый, стандартызацыі ў трох пакаленнях адукацыйных стандартаў, канструяванні зместу ў пяці пакаленнях школьнай вучэбнай гістарычнай літаратуры з улікам рэалізацыі дзяржаўнай гістарычнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь, структураванні зместу адукацыі па канцэнтрычным і лінейным прынцыпах, рэалізацыі культуралагічнага і кампетэнтнаснага падыходаў.

Навуковую навізну даследаванню надае выяўленне саіскальнікам тэндэнцый развіцця школьнай гістарычнай адукацыі як інстытуцыянальна-ведамаснай сістэмы, якія сведчаць аб змене ў мэтавызначэнні ад захавання прадметацэнтрызму да арыентаванасці на развіццё асобы; аб пераемнасці ў прынцыпах абнаўлення зместу (антрапалагізацыі, культурна-гістарычнага асяроддзя, гістарычнай дыялагічнасці); аб цыклічнасці ў рэалізацыі канцэнтрычнага і лінейнага прынцыпаў структуравання зместу; аб актуалізацыі светапоглядна-выхаваўчай, кансалідуючай гістарычную памяць функцый адукацыі. Навуковая навізна даследавання школьнай гістарычнай адукацыі як сацыягуманітарнай з'явы перспектыўна звязана з рэалізацыяй нацыястваральнага патэнцыялу гісторыі Беларусі ў працэсе фарміравання нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці вучняў і каштоўнасці дзяржаўнага

суверэнітэту; з удакладненнем прынцыпаў адбору зместу; з інтэграцыяй гісторыі Беларусі і сусветнай гісторыі.

Праблематыка гісторыка-педагагічнага даследавання актуалізуецца праз прадстаўленае ў аўтарэфераце апісанне сацыяльна-педагагічнай мадэлі патрыятычнага выхавання вучнёўскай моладзі, якая звязана з рэалізацыяй Праграмы патрыятычнага выхавання насельніцтва Рэспублікі Беларусь на 2022–2025 гг.

Варта абазначыць практычную значнасць даследавання, звязаную з выкарыстаннем яго вынікаў на курсах павышэння кваліфікацыі настаўнікаў гісторыі, у тым ліку ў Брэсцкім абласным інстытуце развіцця адукацыі.

Асабісты ўклад саіскальніка пацвярджаецца яго ўдзелам у стварэнні 19 вучэбных дапаможнікаў па вучэбным прадмеце «Чалавек і свет. Мая Радзіма – Беларусь», сусветнай гісторыі і гісторыі Беларусі з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Вывучэнне зместу аўтарэферата дазваляе зрабіць выснову аб дасягненні саіскальнікам мэты дысертацыйнага даследавання, якая прадугледжвае вызначэнне і абгрунтаванне канцэптуальных асноў развіцця ў Рэспубліцы Беларусь школьнай гістарычнай адукацыі як комплекснай шматкампанентнай і шматфактарнай педагагічнай сістэмы.

Афармленне атарэферата адпавядае патрабаванням Інструкцыі аб парадку афармлення кваліфікацыйнай навуковай работы (дысертацыі) на атрыманне вучоных ступеняў кандыдата і доктара навук, аўтарэферата і публікацый па тэме дысертацыі ў рэдакцыі пастановы Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 22 жніўня 2022 г. № 5.

Аўтарэферат дысертацыі С.В. Панова «Развіццё школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь» сведчыць аб адпаведнасці саіскальніка навуковай кваліфікацыі доктара педагагічных навук па спецыяльнасці 13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі.

Водзыў заслуханы і абмеркаваны на пасяджэнні кафедры педагогікі ўстановы адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна» (пратакол № 10 ад 10 лютага 2025 г.

Эксперт: прафесар кафедры педагогікі,
доктар педагагічных навук, прафесар Г.М. Сендзер

Загадчык кафедры педагогікі,
кандыдат педагагічных навук, дацэнт М.М. Мозерава

Установа адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»
АДДЗЕЛ КАДРАЎ

Подпіс Сендзер Г.М., Мозеравай М.М. пацвярджаю
Нач. АК БрДУ ..........